# Польскі пантэон развальваецца ў руіны

Усё пачалося ад Адама Міцкевіча. Грамадзкасьці стала вядома выказанае некім неасьцярожна па тэлевізары сьцьверджаньне аб разнастайных, на жаль, прыкметах праўдападобнасьці, што пясьняр быў беларуска–габрэйскага паходжаньня. Бо Міцкевічы, вядома, нашчадкі нейкага Міцькі, альбо Дзьмітрыя, бацька Адама — Мікалай, дзядзька — Базыль, а бабуля, што тут утойваць, габрэйка! Гэтага было ўжо занадта для чальцоў магістрату гораду Лодзь, і яны перайменавалі вуліцу Міцкевіча на Пілсудзкага. Не пасьпелі зьмяніць назвы, як на сапраўдных палякаў спаў чарговы ўдар. На паверхню выплылі дакумэнты, у якіх асоба, вядомая ў Польшчы як маршал Юзаф Пілсудзкі, сьцьвярджае, што завецца ён Восіп Восіпавіч (!) Пілсудзкі, што ён каталіцкага веравызнаньня, паходжаньня — шляхецкага, а нацыянальнасьці — беларускай. На гэты раз усе нібы вады ў рот набралі, бо што тут скажаш?

Але ж на гэтым не канец. Нейкі Радэк Сікорскі*, які задоўга знаходзіўся ў цёплых краінах і забыўся, што дрэнная тая птушка, якая паганіць уласнае гняздо, меў нахабства сьцьвердзіць, што Начальнік Касьцюшка ня быў палякам. Радэк мяркуе, напэўна, толькі пра тое, што Касьцюшка меў большую ўладу, чым ён сам, усяго толькі віцэ–міністар нацыянальнай абароны, і меў амэрыканскае грамадзянства, у той час як пан віцэ–міністар — брытанскае. Урад, аднак, выдаў заяву, што няпраўда, нібы Начальнік ня быў палякам. Але што ж з таго, дастаткова рушыць камень, каб пасыпалася лавіна.

Як было ў сапраўднасьці з тым Касьцюшкам? Сам называе сябе ліцьвінам, што ў XVIII стагодзьдзі азначала “жыхар Вялікага Княства Літоўскага” — хутчэй сёньняшняга беларуса, чым літоўца, бо тых звалі ў свой час жмудзінамі. Зрэшты, Касьцюшкі (нашчадкі Косьці альбо Канстанціна) аселі на зямлі Берасьця, на беларускім Палесьсі. Аднак тое, дзе і калі нарадзіўся будучы Начальнік і як яго ў сапраўднасьці звалі, да сёньняшняга дня застаецца загадкай. Вось найбольш праўдападобная вэрсія.

Быў ахрышчаны сваёй праваслаўнай маткай Тэкляй (Фёклай), дзявочае прозьвішча якой Ратомская, у царкве як Андрэй, у гонар апостала Андрэя, сьвята якога прыпадала якраз на той дзень. Часы тады не былі лепшымі для іншаверцаў, чым сёньня, і шляхецкіх дзяцей, ахрышчаных раней у царкве, хрысьцілі паўторна, каб не зачыняць перад імі дзьверы да кар’еры. Вось чаму Касьцюшкі 12 лютага 1746 году ў касьцёле ў Косаве ахрысьцілі Андрэя Тадэвуша Банавэнтуру Касьцюшку. Адсюль прыблізна месцам яго нараджэньня называецца Мерачоўшчына пад Косавам. Якое хрышчэньне было важнейшым — пакінем гэтае пытаньне для вырашэньня тэолягам. Быць можа, у Косаве афармілі толькі фіктыўныя мэтрыкі, што ў тыя часы часта практыкавалася. Сам Касьцюшка на працягу жыцьця захоўваў рэлігійную абыякавасьць.

І адкуль жа нам гэта вядома? Мэханізм, які сёньня замяняе Тамару ў Тэрэзу, Ніну ў Яніну, а Мікалаяў у Казікаў і Збышкаў, якія нікуды (г. зн. ні ў адзін храм) ня ходзяць, — гэты мэханізм быў запушчаны даўным–даўно.

Цікава таксама і тое, што, як і многія нашыя сучасьнікі, Касьцюшка перастаў маскіравацца пасьля вяртаньня з Амэрыкі, куды ў свой час падаўся “на хлеб”. Праклямацыю паўстаньня ў Вялікім Княстве Літоўскім ён выдаў на беларускай мове, вяртаючы тым самым ёй пасьля ста гадоў дзяржаўны характар, і падпісаўся кірыліцай “*Фадей Костюшко*”. Пэўна, не падпісаўся “Андрэй”, бо ніхто б ня ведаў, што за ён, але прынамсі з Тадэка стаў Федзькам.

Глядзі, Касьцюшка, на нас зь неба, хто наступны?

*Друкуецца паводле:*
Літаратура і мастацтва. 1993. 30 ліпеня. № 30. С. 15.

---

* Маецца на ўвазе Сікорскі (*Sikorski*) Радаслаў (нар. 1963) — польскі палітычны дзеяч, з 2007 г. міністар замежных спраў Польшчы.